ЛЕГЕНДЫ ЗУСІМ БЛІЗКА АД НАС!

Рэальныя гістарычныя падзеі лёгка пераплятаюцца з легендамі. Асабліва калі казаць пра тое, што адбылося сотні гадоў таму. І як правесці мяжу паміж праўдай і выдумкай? А можа, яна зусім непатрэбная? Легенды — гэта не навуковыя факты, легенды — гэта яскравае праяўленне адметнай культуры людзей, якія жылі ў свой час на сваёй зямлі.

Ісціна дзесьці побач

Заходзячы ў кніжныя крамы, заўсёды звяртаю ўвагу на паліцы з паштоўкамі. Часта даводзіцца канстатаваць сумны факт — выбар у нас не вельмі багаты. Нацыянальная бібліятэка, касцёл святых Сымона і Алены, праваслаўны Кафедральны сабор, Цэнтральны чыгуначны вакзал — гэта амаль усё, што можна пабачыць. Часам з'яўляецца нешта неардынарнае, але гэта адзінкавыя выпадкі. А так хочацца чагосьці незвычайнага...

Праўду кажуць: калі нечага вельмі-вельмі хочаш, то яно абавязкова спраўдзіцца? У газетным шапіку натыкнуўся на нешта новае. Увагу прыцягвала як нестандартнае каляровае афармленне камплекта паштовак, так і назва — «Легенды старога Мінска», выдадзены кампаніяй «Артыя Груп». Проста сысці я, безумоўна, не мог. Нібы нейкая таямніца, яны прыцягвалі да сябе. Напэўна, інакш і не можа быць, калі гаворка ідзе пра гісторыю горада, старэйшага за Маскву і Варшаву, Вільню і Берлін. Горада, які дзясяткі разоў быў зруйнаваны бясконцымі войнамі. У такога месца проста не можа не быць цікавых, нават містычных гісторый.

І паштоўкі толькі пацвердзілі гэтыя думкі. Прычым яны самі па сабе незвычайныя: з аднаго боку, выява, апрацаваная пад стары фотаздымак, з іншага — легенда, звязаная з гэтай мясцінай. Яны падарылі мне не толькі эстэтычнае задавальненне, але і старажытныя паданні, чуць пра якія раней не даводзілася. А вы шмат ведаеце пра Мінск? Давайце праверым!

Прывід у цемры лістападаўскай ночы

Кажуць, позняй восенню, у канцы XIX стагоддзя, хавалі ў Мінску маладую прыгожую паненку. Сваякі паклалі яе ў труну, адпелі і пахавалі ў склепе на Кальварыйскіх могілках. Але як выявілася, дзяўчына проста заснула ў летаргічным сне. Прачнуўшыся ўжо ў труне, яна не здолела выбрацца і памерла ў пакутах. З таго часу яе прывід пачаў з'яўляцца на могілках у цёмныя ночы лістапада. Многія з тых, хто праходзіць ноччу каля могілак, кажуць, што тут блукае белая здань.

Дарэчы, пачатак Кальварыйскім могілкам даў Кальварыйскі касцёл, пабудаваны ў 1745 годзе на жмені зямлі, прывезенай з месца распяцця Хрыста — Галгофы (Кальварыі — на лацінскай мове). Ёсць гістарычныя сведчанні, што тут пахаваныя Радзівілы і Панятоўскія. Пазней тут хавалі салдатаў напалеонаўскай арміі, палонных аўстрыйцаў часоў Першай сусветнай вайны, ахвяраў бальшавіцкага тэрору, тры тысячы яўрэяў з мінскага гета падчас Вялікай Айчыннай вайны...

Прарочы сон ратуе ад халеры

У 1631 годзе Мінск не абмінула эпідэмія халеры. Адзін мінчанін убачыў прарочы сон: горад ад поўнага вымірання выратуе статуя Святога Роха, захаваная пад руінамі Касцёла баніфатараў (міласэрных братоў). Даведаўшыся пра гэта, гараджане неадкладна пачалі шукаць статую, і праз некаторы час яна была знойдзена. Статую ўрачыста пранеслі па горадзе і ўстанавілі ў драўлянай капліцы на Залатой Горцы. Пасля гэтага эпідэмія пайшла на спад, а потым і зусім спынілася.

Касцёл Святога Роха быў пабудаваны ў 1861—64 гадах. Асноўнымі славутасцямі храма з'яўляюцца старажытная ікона Багародзіцы з Ісусам, а таксама цудадзейная статуя Святога Роха.

Прагнасць да Камароўскага балота давядзе

У XV стагоддзі на ўскраіне Мінска стаяў манастырскі сабор. Прасіў міласціну на яго паперці юродзівы Федзька Камар. Аднойчы ў саборы пад каменнай плітою знайшоў стары манах золата. Убачыў гэта Федзька Камар, які начаваў у храме, і пачаў дакучаць манаху: «Дай палову!» Спужаўся манах, што Федзька ўсё настаяцелю раскажа, і згадзіўся аддаць таму палову золата. Пайшлі яны ў лес, за Троіцкую гару, золата хаваць. Асляпіла іх золата, пабіліся яны паміж сабою і патанулі ў балоце.



З таго часу пачалі называць гэта балота Камароўскім. Потым узнікла на яго месцы вёска Камароўка, якая да 1812 года належала князям Радзівілам. Пазней вёска ўвайшла ў межы горада. У 1911 годзе тут была адкрыта Балотная станцыя — адзін з цэнтраў вывучэння і практычнага выкарыстання балотаў Расіі. На пачатку XX стагоддзя Камароўка лічылася адной з самых заняпалых працоўных ускраін, якую насяляла рамесная бедната. На палігоне, які знаходзіўся на месцы сучаснага рынку, 24 і 25 мая 1911 года выконваў палёты на аэраплане славуты расійскі авіятар Сяргей Ісаевіч Утачкін. Убачыць гэты цуд тады сабраўся ўвесь горад.

У 20-я гады XX стагоддзя балота асушылі. Камароўскую плошчу, якая знаходзілася на месцы легендарнай вёскі, у 1956 годзе перайменавалі ў плошчу Якуба Коласа. А ў 1972 годзе ў цэнтры плошчы ўзвялі помнік народнаму паэту. У 1979 годзе адчынілі цэнтральны калгасны рынак — самы вялікі ў нашай краіне...



Маленькая парада на заканчэнне

Вас закранулі гэтыя легенды, якія прайшлі праз дзясяткі пакаленняў? Спадзяюся, што так. Тады вы яшчэ паспееце набыць «Легенды старога Мінска» і даведацца пра астатнія містычныя і рамантычныя гісторыі. Толькі трэба паспяшацца, тыраж не вельмі вялікі! Не ўспрымайце гэтыя словы як рэкламу. Хутчэй — гэта шчырая парада. Яно сапраўды таго варта!

Яўген ВАРАКСА.
У матэрыяле выкарыстаны выявы паштовак з камплекта «Легенды старога Мінска».

ШАШКІ

Пад рэдакцыяй майстра спорту Мікалая ГРУШЭЎСКАГА

«ПАГОДА Ў ДОМЕ»-6

Працягваем гэты класіфікацыйны конкурс заданнем № 7 — камбінацыйнай праблемай:



Белыя: a1, d2, e1, e3, f2, g3, g5 (7). **Чорныя:** a3, b6, e5, f4, h2, h6 (6). Выйгрыш.

Заданне праверана на супадзенне і дакладнасць рашэння нашым кансультантам з Літвы Антанасам Гімбутасам — па электроннай пошце.

Тэрмін для адказаў традыцыйны — два тыдні. Накіроўвайце іх на адрас: **220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а, рэдакцыя газеты «Звязда», рубрыка «Шашкі»**.

ДАМАЧНЫЯ КАНЦОЎКІ

Наш актыўны аўтар Леанід Вітошкін прапануе для прыхільнікаў шашак-100 бліц-50/6:



Белыя: 21, 22, 33, 34, 43, 47, дамка 27 (7). **Чорныя:** 8, 9, 10, 11, 16, 20, 37, дамка 28 (8). Перамога белых.

Па-за конкурсам развяжыце і такую яго дамачную канцоўку:

Белыя: 12, 17, 22, 25, 33, 34, 39, дамка 45 (8). **Чорныя:** 6, 16, 28, 35, 37, дамкі 26, 30 (7). Перавага белых.

Таксама будзем рады вашым рашэнням.

РАЗБЯРЫЦЕ КАНСТРУКЦЫЮ

Мікалай Вяргейчык, як і педагог Л. Вітошкін, жыве ў Гомелі, працуе апаратчыкам на хімзаводзе. Іх аб'яднаўвае шашачная кампазіцыя. Выносім на ваш суд творы на 64-клетачнай дошцы, дасланыя ім у рэдакцыю:

№ 1. **Белыя:** a1, b6, c7, d6, e1, f2, f4 (7). **Чорныя:** a5, b2, c3, d8, h2, h4, h6 (7).

e7, e5, g3 (f2A) g3, d8, d8:d2:g5, g3x. A(f4) d8, d8:d2:g5 (f6B) g7, d2/f2x. B(f4) g3, g3x.

№ 2. **Белыя:** b6, c1, c5, d4, d6, e3, g7 (7). **Чорныя:** a7, b8, d2, d8, f4, g3, g5 (7).

dc7, c5, f8, d4, d8:f2:e7, e7x.



№ 3. **Белыя:** b6, c5, d4, e5, g7, h4, h6 (7). **Чорныя:** a7, d2, e7, f2, f6, g3, h8 (7). Аматары вострых пачуццяў застануцца задаволенымі, калі самастойна разбяруць гэтую канструкцыю 7 на 7.

РАШЭННІ

Калі ласка, праверце свае рашэнні ранейшых заданняў:

«Пагода ў доме»-6/5 (М. Грушэўскі): 1. ab2 2. gh6 3. h:f8 4. e:g7 h:f6 5. fg7! 6. h:f6x

Бліц-50/4 (М. Грушэўскі): 14, 20, 8, 4, 6, 50x.

«Рашаем, удакладняем»(А. Кагоцька): № 2 — 1. cd8 a:c7A 2. d:a5 3. a:c7 4. c:a1x. A1...h:f2 2. de7 3. ed6 4. d:a1x.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

по продаже объектов республиканской собственности и права заключения договора аренды земельного участка для обслуживания продаваемого недвижимого имущества

Предмет аукциона, место нахождения имущества, информация о земельном участке	**Лот № 1**
	Капитальное строение инв. № 450/С-1714, расположенное по адресу: Гродненская область, г. Слоним, ул. Гнидаша, д. 3, и право заключения договора аренды земельного участка с кадастровым номером 425450100001006857 площадью 0,1339 га сроком на 50 лет
Начальная цена предмета аукциона – 244 298 896 руб., сумма задатка - 24 429 000 руб.	
Продавец недвижимого имущества: Департамент охраны Министерства внутренних дел Республики Беларусь, контактные телефоны: (8 0152) 41 78 96	
Характеристика объектов недвижимого имущества: производственный корпус с двумя пристройками 1949 г. площадью 684,1 кв. м, фундамент бутобетонный, перекрытия деревянные, стены и перегородки кирпичные, кровля шиферная, полы бетонные; **асфальтовое покрытие** 2000 г. площадью 253 кв. м; **водопроводная сеть** 1949 г. протяженностью 42,5 п. м	
Условия использования недвижимого имущества: вовлечение в хозяйственный оборот в течение 2-х лет с момента регистрации перехода права собственности на объекты	
Условия использования земельного участка, ограничения по использованию: получение в установленном порядке разрешения райисполкома на проведение проектно-изыскательских работ и разработку строительного проекта на строительство объекта в срок, не превышающий 2 года; осуществление строительства объектов в сроки, определенные проектно-сметной документацией; осуществление в двухмесячный срок после принятия решения райисполкома о предоставлении земельного участка, государственной регистрации права на земельный участок	
Организатор аукциона: Гродненский областной территориальный Фонд государственного имущества (Фонд «Гродноблимущество»), 230023, г. Гродно, ул.17 Сентября, 39, тел. (8 0152) 74 53 86, 72 15 29, 74 53 82 (время работы с 8.30 до 13.00 и с 14.00 до 17.30, кроме выходных и праздничных дней)	

1. Аукцион состоится **9 ноября 2009 года в 11.00** по адресу: 230023, г. Гродно, ул. 17 Сентября, 39.

2. Аукцион является открытым, его участниками могут быть граждане, юридические лица и индивидуальные предприниматели Республики Беларусь, а также иностранные инвесторы.

3. Заявления на участие в аукционе принимаются Организатором аукциона **по 5 ноября 2009 года** до 16.00, по адресу: г. Гродно, ул. 17 Сентября, 39, **кабинет 6.**

К заявлению прилагаются следующие документы:

- заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет Организатора аукциона – Фонда «Гродноблимущество» № 3642900000187, МФО 152101752 в филиале 400 Гродненского областного управления ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Гродно, УНП 500044549;
- юридическим лицом Республики Беларусь или индивидуальным предпринимателем – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования;
- иностранным юридическим лицом – копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, при необходимости легализованные в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык;
- иностранным гражданином или лицом без гражданства – документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, при необходимости легализованный в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык;
- представителем заявителя (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель) – доверенность, выданная в установленном законодательством порядке, при необходимости легализованная в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица также – документ, подтверждающий его полномочия. Представителям юридических лиц просьба иметь при себе учредительные документы.

4. Желающим предоставляется возможность предварительно ознакомиться с объектами продажи.

5. Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона (продажи конкретного предмета аукциона) в любое время, но не позднее чем за три дня до даты его проведения; имеет право снять предмет аукциона с аукциона в любое время до объявления его проданным.

6. Аукцион по конкретному предмету аукциона признается несостоявшимся, если:

- заявление на участие в нем по конкретному предмету аукциона подано менее чем двумя участниками;
- ни один из его участников после трехкратного объявления первой цены не поднял аукционный номер;
- ни один из его участников в соответствии с решением комиссии по проведению аукциона не был признан победителем.

7. В случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником, предмет аукциона продается этому участнику (далее – претендент на покупку) при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

8. Не допускается начало торгов и продажа предмета аукциона по начальной цене. После объявления очередной цены аукционист называет номер участника аукциона, который первым поднял аукционный номер, и указывает на него, а затем в соответствии с шагом аукциона объявляет новую цену. Аукцион продолжается до тех пор, пока по новой объявленной аукционистом цене аукционный номер поднимет только один участник аукциона. Аукционист называет последнюю цену и номер данного участника трижды и объявляет предмет аукциона проданным, а участника аукциона – победителем аукциона по соответствующему предмету аукциона.

9. Решение о предоставлении победителю аукциона (претенденту на покупку) земельного участка принимается местным исполнительным комитетом в течение 10 рабочих дней после утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона.

10. Победитель аукциона (претендент на покупку) обязан в течение 10 рабочих дней со дня принятия местным исполнительным комитетом решения о предоставлении земельного участка внести плату за право заключения договора аренды земельного участка, возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения, расходы, связанные с формированием земельных участков и изменением земельных участков в результате такого формирования, государственной регистрацией в отношении этих участков.

После совершения победителем аукциона (претендентом на покупку) указанных действий, но не позднее 2 рабочих дней, с ним в установленном порядке, в соответствии с условиями аукциона, Продавцом заключается договор купли-продажи недвижимого имущества, а местным исполнительным комитетом – договор аренды земельного участка.

11. Оплата стоимости приобретенного предмета аукциона осуществляется в установленном законодательством порядке: победителем аукциона (претендентом на покупку), являющимся резидентом Республики Беларусь, в рублях; победителем аукциона (претендентом на покупку), являющимся нерезидентом Республики Беларусь, в рублях либо в иностранной валюте по курсу Национального банка на дату платежа. Срок оплаты недвижимого имущества – в течение 30 календарных дней со дня заключения договора купли-продажи.

12. В случае невыполнения условий продажи объекта приобретателем имущества договор купли-продажи расторгается в одностороннем порядке без компенсации затрат.

Аэробус А320 авіякампаніі «Аэрафлот» гатовы да вылету ў Маскву

Самалёт Аэробус А320 расійскай авіякампаніі «Аэрафлот», які зрабіў аварыйную пасадку ў Нацыянальным аэрапорце «Мінск» 4 кастрычніка, гатовы да вылету. Пра гэта паведаміў кіраўнік прадстаўніцтва «Аэрафлота» ў Мінску Аляксандр СУШКО.

«Пасажыры рэйса «Прага — Масква» адпраўлены ў Маскву на рэзервовым самалёце. Што датычыцца аэробуса А320, то ён гатовы да вылету, мы чакаем дазволу авіяцыйных уладаў», — сказаў Аляксандр Сушко.

Нагадаем, самалёт А320 расійскай кампаніі «Аэрафлот», які ляцеў па маршруце Прага — Масква, 4 кастрычніка ў 15.53 зрабіў аварыйную пасадку ў Мінску. Паводле даных «Аэрафлота», на борце знаходзіліся 120 пасажыраў і шэсць членаў экіпажа. Прычына вымушанай пасадкі — няправільна спрацавала сігналізацыя аб адчыненні дзвярэй. Як паведамілі ў Нацыянальным аэрапорце «Мінск», пасадка прайшла паспяхова і пацярпелых у выніку інцыдэнту няма.

БЕЛТА.

Супрацьпухлінныя парады

Інфарм-укол

ХАРЧАВАННЕ

1. Імкніцеся істотна абмежаваць ужыванне вэнджанага, смажанага, марынадаў, кансерваў, саленняў.
2. Ніколі не ўжывайце прадукты з цвіллю.
3. Для пітця і гатавання страў выкарыстоўвайце ваду, ачышчаную з дапамогай побытавых фільтраў.
4. Прадукты лепш ужываць варанымі або тушанымі.
5. Ежа і піццё не павінны быць гарачымі.
6. Колькасць алкаголю, ужытага за адзін прыём у дзень, не павінна перавышаць чарку гарэлкі, або шклянку сухога віна, або бутэльку піва.
7. Вытрымлівайце закон памяркоўнасці: колькасць энергіі, якая паступае з ежай, павінна адпавядаць колькасці той, што вы расходуеце.
8. Павялічце колькасць прадуктаў, якія валодаюць супрацьпухлінным, антыканцэрагенным дзеяннем: жоўта-зялёная, аранжавая гародніна і садавіна, цытрусавыя, крыжакветная гародніна, ягады, цыбуля, часнок, бабовыя, чай, сухафрукты, малочныя прадукты, морапрадукты.
9. Штодня ў рацыёне павінны быць харчовыя валокны з цэльных зярнят або вотруб'я злакавых.

ФІЗІЧНАЯ НАГРУЗКА

Рэгулярныя заняткі спортам, нават элементарная штодзённая зарадка, дапаможа захаваць здароўе. Не думайце, што такая нагрузка патрэбна толькі для прыгажосці, маўляў, «мяне і такую любяць». Паніжаная фізічная актыўнасць спрыяе парушэнню работы сасудаў, эластычнасці мышц, з'яўленню лішняй вагі, а гэта — прамы шлях да развіцця не толькі сардэчна-сасудзістых, але і анкалагічных хваробаў.

ПСІХАЛОГІЯ

Шукайце плюсы нават у негатыўных сітуацыях. Не расцэньвайце выпадковую непрыемнасць як жыццёвую катастрофу. Любіце сябе і сваё цела. Паўнацэнны адпачынак (а не на адно вока), змена дзейнасці, прыемныя фізічныя нагрузкі, любімыя заняткі дапамогуць спраўляцца са стрэсамі.

Вядучая рубрыкі Святлана БАРЫСЕНКА.

«УЯЎЛЯЕ АСАБЛІВУЮ НЕБЯСПЕКУ...»

Вярхоўны суд разгледзеў касацыйную скаргу па справе Васіля Юзэпчука, якога 29 чэрвеня Брэсцкі абласны суд прыгаварыў да расстрэлу за забойствы 6 адзінокіх пенсіянерак у Драгічынскім раёне.

Як выявіла следства, дзвюх жанчын Юзэпчук забіў сам, а чатырох адправіў на той свет разам з 28-гадовым братам сваёй грамадзянскай жонкі Сяргеем Гучэнкам (апошняга суд прыгаварыў да пажыццёвага зняволення з адбываннем пакарання ў папраўчай калоніі спецыяльнага рэжыму). Абодва родам з Украіны, пражывалі на тэрыторыі Драгічынскага раёна. Абодва не мелі пастаяннага месца працы. На рахунку Юзэпчука, акрамя таго, два рэальныя тэрміны ў месцах пазбаўлення волі.

«Я не забіваў», «Я не вінаваты», «Я не змог бы гэтага зрабіць» — падобныя фразы гучалі з вуснаў 30-гадовага Васіля Юзэпчука ў зале Вярхоўнага суда неаднаразова.

— А чаму вы прызналі падчас папярэдняга расследавання сваю віну?

— Мяне прымусілі гэта зрабіць драгічынскія міліцыянеры. Хацелі за мой кошт павысіцца ў званні. Я іх памятаю візуальна, але прозвішчаў не ведаю. Яны гвалтоўна прымушалі даваць паказанні супраць самога сябе. Збівалі мяне, давалі таблеткі. Білі са словамі, «рабі тое, што будзем табе казаць». Я не адмаўляю, што ведаў гэтых бабак. Я ім дапамагаў з дровамі, бульбай. І Гучэнка іх таксама ведаў. Ён у іх таксама працаваў. Усе людзі з вёсак ведалі, што мы працавалі ў іх. Пра смерць бабуляў я даведаўся ад суседкі па тэлефоне. Я не мог гэтага зрабіць, таму што ў той момант мяне там не было, знаходзіўся на тэрыторыі іншай вобласці. Я ім дапамагаў, але не забіваў. Я не вінаваты. Асабіста я ніколі не краў там, дзе працаваў. Маю невінаватасць могуць пацвердзіць сведкі, якіх Брэсцкі абласны суд не выклікаў. У прыватнасці, мая маці.

Адвакаты Юзэпчука таксама прасілі апраўдаць свайго падабароннага і прыпыніць у дачыненні да яго крымінальную справу. Яны адзначылі, што прыгавор вынесены на аснове паказанняў асуджанага, якога прымусілі нагаворваць на самога сябе. Гучэнка ж з прычыны непрыязнага стаўлення абгаварыў свайго сваяка. Усе астатнія доказы пабудаваны на аснове дапушчэнняў. «Мы жывём у XXI стагоддзі, і галоўнай мэтай крымінальнага пакарання з'яўляецца не кара за здзейсненае злачынства. Мэта яго, перш за ўсё, выпраўленне чалавека, — звярнуўся да Вярхоўнага суда адвакат. — Асуджаны непісьменны чалавек, без пастаяннага месца жыхарства, не мае працы. Больш за тое, эксперты прызналі Юзэпчука разумова адсталым, таму ён не можа ў поўнай ступені правільна ўспрымаць навакольны свет. Яму не патрэбна прымусовае лячэнне, бо ён знаходзіцца ў стане свядомасці, аднак разумовая адсталасць уздзейнічае на яго ацэнку сваіх учынкаў. Мы просім аб змякчэнні пакарання, бо смяротнае пакаранне — незваротнае. І калі праз месяц ці два будзе выяўлена, што крадзяжы медалёў і інш. у пацярпелых здзейсніла іншая асоба, то рэабілітаваць Юзэпчука ўжо не будзе магчымасці».

Дзяржаўны абвінаваўца, у сваю чаргу, папрасіў калегію Вярхоўнага суда пакінуць прыгавор без змянення. Віна Юзэпчука, паводле яго слоў, цалкам даказана, суд Брэсцкай вобласці разглядзеў усе аспекты яго справы, і парушэнняў крымінальна-працэсуальнага заканадаўства не выяўлена.

— Пасля экспертызаў трупаў пацярпелых жанчын медыкі вызначылі адну і тую ж прычыну іх смерці — механічная асфіксія (удушэнне), — адзначыў дзяржаўны абвінаваўца. — Судова-медыцынскія экспертызы аб'ектыўна пацвердзілі паказанні злачынцаў аб спосабе забойства пацярпелых. Падчас папярэдняга расследавання Юзэпчук і Гучэнка самі расклалі ўсё па палічках: падрабязна расказалі аб тым, як душылі сваіх ахвяраў. У дамы пенсіянерак пранікалі ноччу. Юзэпчук душыў, а напарнік утрымліваў, не даючы супраціўляцца. Суд палічыў іх віну даказанай. Усе забойствы былі здзейснены з мэтай завалодаць грашыма пажылых жанчын. Довады ж, што супрацоўнікі міліцыі збівалі Юзэпчука, палілі гарэлкай, давалі таблеткі, марылі голадам былі прадметам праверкі органаў пракуратуры. Яны не пацверджаныя. Таму я лічу, што трэба прысуд пакінуць без змянення. Гэты варвар (па-іншаму яго нельга назваць), які здзейсніў забойствы 6 жанчын, пяцярым з якіх было больш за 70 гадоў, і ўчыніў разбой на тэрыторыі Гродзенскай вобласці, уяўляе асаблівую небяспеку для грамадства, таму і пакаранне суд прызначыў адпаведнае. Забойцы павінны панесці заслужанае пакаранне па ўсёй строгасці закону.

Суддзі выслухалі абвінавачванага, яго двух абаронцаў і дзяржаўнага абвінаваўцу — і праз паўтары гадзіны вынеслі свой вердыкт: «Прыгавор пакінуты без змянення». Дарэчы, да расстрэлу сёлета прысудзілі не аднаго Васіля Юзэпчука. Нагадаю, што другі смяротны прысуд быў вынесены Мінскім абласным судом 17 ліпеня. Да найвышэйшай меры пакарання прыгаварылі 25-гадовага жыхара Салігорска Андрэя Жука за забойства ў лютым двух супрацоўнікаў СВК «Бальшавік-Агра», якія перавозілі грошы для выплаты зарплаты работнікам сельгаспрадпрыемства.

Надзея ДРЫЛА.

Смяротны прыгавор Васілю ЮЗЭПЧУКУ Вярхоўны суд пакінуў у сіле.

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Рэзананс

Пасмейваемся мы? Пасмяюцца і з нас

...Досыць часта сустракаю на старонках «Звязды» артыкулы, тэмы, якія мяне, чытача, як кажуць, чапляюць за «жывое», падбіваюць выказацца.

Апошнім часам з цікавасцю чытаў артыкулы спадароў Валошына і Лабадзенкі пра іх вандроўкі па Еўропе. Асобны дзякуй за аповед пра Скарынаўскія мясціны ў Празе. Я таксама там жыў, таксама блукаў па вулачках! Цудоўна памятаю свае ўражанні, свае пачуцці, калі знайшоў і сам помнік слыннаму земляку, і шыльду на доме...

Гэтаксама ў памяці і маё жаданне абавязкова, ды што там — проста зараз жа, тэрмінова расказаць іншым, дзе гэта знаходзіцца... Таму ўвесь шлях, па якім да гэтых месцаў можна трапіць, я сфатаграфаваў, адзначыў на карце.

І тут узнікла пытанне: як гэту інфармацыю данесці да іншых? Правільна, праз інтэрнэт. Але ж я не праграміст і стварыць свае сайты не ўмею (тым больш, што за іх і грошы трэба плаціць)...

Вось у такой сітуацыі могуць дапамагчы сацыяльныя сеткі («Звязда» таксама пра іх пісала). Яны бясплатныя і даступныя — пры жаданні любы чалавек можа, напрыклад, зайсці на маю старонку і ўбачыць, як у Празе адшукаць помнік Скарыне.

Чаму ён для мяне такі важны? Я па адукацыі гісторык і даўно заўважыў, што іншыя дзяржавы будуюць свой, так бы мовіць, імідж на імёнах слынных землякоў, як могуць, кажучы сучаснай мовай, «раскручваюць» іх. У Чэхіі, як заўважылі журналісты «Звязды», гэта Кафка і іншыя. У нас — Францыск Скарына...

Вялікі дзякуй газеце і за артыкул пра выдатнага дзеяча беларускай гісторыі, гетмана ВКЛ Канстанціна Астрожскага. Калі пашукаць, каго са слынных палкаводцаў можна паставіць з ім побач, прыйдзе на памяць хіба Аляксандр Македонскі. Але ж ён пры гэтым знаны ва ўсім свеце, а Астрожскага не ведаюць нават у Беларусі. Прынамсі, 8 верасня я спытаўся ў вучняў, што гэта за дзень у нашай гісторыі і што за чалавек Астрожскі. Дзеці здзіўлена паціснулі плячыма.

Вось так. Гісторыі сваёй не ведаем, роднай мовы таксама...

Мы ўжо звыкліся з думкай, што яна, беларуская, знікла ў гарадах, але ж (у мяне асабіста) засталіся яшчэ надзеі на вёску. Марна, спадарства! Не так даўно я ўладкаваўся працаваць па спецыяльнасці — настаўнікам гісторыі. І...

Уявіце сабе: школа — вясковая, беларускамоўная. Думаў — во як пашчасціла, трапіў у сапраўдны асяродак беларускасці! Не і яшчэ раз не! Роднай мовай дзеці не валодаюць. Пачаў выкладаць гісторыю, як і патрабуе праграма — па-беларуску, ужываючы лексіку з падручнікаў, а вучні ў большасці глядзяць на мяне круглымі вачамі, не разумеюць.

Патраціў колькі часу, многае патлумачыў — з разуменнем стала лягчэй, але ж размаўляць на роднай мове, адказваць на пытанні вучням усё адно цяжка, яны ўвесь час збіваюцца на другую дзяржаўную, больш за тое, час ад часу просяць мяне, каб і я гаварыў з імі па-руску, бо ім, маўляў, цяжка ўспрымаць беларускую...

Яшчэ раз падкрэслю, што гэта — вясковая і беларускамоўная школа і што ад мовы адмаўляюцца не сталыя, не старыя людзі, а дзеці — наша будучыня, наш заўтрашні дзень.

Думаю, гэта самым красамоўным чынам паказвае, у якім катастрафічным стане знаходзіцца наша мова.

Зрэшты, ці трэба здзіўляцца таму, што дзеці не разумеюць яе (не любяць, не ведаюць), калі апроч школы яе нідзе не чуваць і не відаць? Тэлебачанне амаль цалкам на рускай, друк — таксама, на ёй жа ўсе шыльды на вуліцах, уся дакументацыя і інш.

У чым выйсце? На маю думку, у тым, каб пераводзіць усё што магчыма на сваю, на першую дзяржаўную, каб яна (на ўзроўні падсвядомасці) уваходзіла ў светаадчуванне беларусаў з самага іх маленства. І рабіць гэта трэба на дзяржаўным узроўні, сёння.

...Не раз чуў, як людзі тутэйшыя пасмейваюцца: украінцы, маўляў, «зусім таго» — на сваю мову перакладаюць розныя мастацкія фільмы. Але, спадарства, ці не здарыцца так, што ў хуткім часе ўкраінцы будуць пасмейвацца з нас. Асабліва калі мы страцім сваю мову, страцім найпершую адметнасць нацыі.

Вадзім ШЫШКО.

РУП «ГОМЕЛЬСКИЙ ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»

➢ **ОЦЕНКА ИМУЩЕСТВА (недвижимость, транспорт, оборудование, бизнес, интеллектуальная собственность)**
➢ **ОРГАНИЗАЦИЯ И ПРОВЕДЕНИЕ АУКЦИОНОВ**

извещает о проведении 3 ноября 2009 г. открытого аукциона по продаже объектов недвижимости, расположенных по адресу: Гомельская область, Гомельский район, Бобовичский сельсовет, севернее деревни Осовцы (карьер «Осовцы») и принадлежащих ОАО «Гомельстройматериалы» на праве собственности

№ лота	Наименование объектов	Краткая характеристика объектов
1	**Ремонтная мастерская**	Назначение: здание специализированное для ремонта и технического обслуживания автомобилей (инв. № 310/С-33356). Отдельно стоящее одноэтажное здание. Общая площадь: 214,1 кв.м. Фундамент: железобетонный. Наружные, внутренние капитальные стены: железобетонные панели, кирпичные. Перегородки: нет. Перекрытия чердачные: ж/бетонные плиты, ребристые. Перекрытия междуэтажные: нет. Крыша: совмещенная. Полы: гравийно-песчаная смесь. Проемы оконные: сплошное деревянное остекление. Ворота: металлические. Наружная отделка: цоколя – оштукатурен; стен – нет. Внутренняя отделка – известковая побелка. Отопление: нет. Электроснабжение: открытая проводка. Вентиляция: естественная.
	Бытовые помещения с материальным складом	Назначение: здание специализированное складов, торговых баз, баз МТС, хранилищ (инв. № 310/С-33354). Отдельно стоящее одноэтажное здание с крыльцом, воротами, забором и калиткой. Общая площадь: 91,4 кв.м. Фундамент: железобетонный. Наружные, внутренние капитальные стены: железобетонные блоки, кирпичные. Перегородки: кирпичные. Перекрытия чердачные: железобетонные плиты. Крыша: совмещенная. Полы: линолеум, бетон. Проемы оконные: деревянные двойные. Ворота: щитовые. Наружная отделка цоколя – оштукатурен. Внутренняя отделка: штукатурка, побелка, окраска. Отопление: частичное – электротэн. Электроснабжение: открытая, скрытая проводка. Вентиляция: естественная.
	Низковольтные сети до 0,4 кВт	Назначение: сооружение специализированное энергетики (инв. № 310/С-33353). Кабельная с источником питания КТПН-160/6. Рабочее напряжение 0,4 кВ. Протяженность 58 м. Способ прокладки: подземный.
	Кран-балка	Кран подвесной электрический однобалочный общего назначения. Грузоподъемность – 3,2 т. Максимальная высота подъема – 18 м. Длина крана – 10,2 м. Пролет крана – 6 м. Частота вращения электродвигателя – 1360 об/мин.
	Земельный участок: площадью 1,5429 га с кадастровым номером 321080200002000021. Решение о выделении Гомельского РИК №1030 от 07.12.2004 г.	

Начальная цена продажи лота – 132 497 480 бел. руб. (в т.ч. НДС 18 %). Задаток – 13 249 748 бел. руб. (в т.ч. НДС 18 %).
Цель использования объектов не ограничивается. Шаг аукциона – 7 %.

Аукцион состоится 3 ноября 2009 г. Начало в 10.00 по адресу: г. Гомель, ул. Артема, 23, каб. 2-6

Документы на участие в аукционе принимаются по адресу: **г. Гомель, ул. Артема, 23, 2-й этаж, каб. 2–6** по рабочим дням с 9.00 до 12.00 и с 14.00 до 16.00 **по 30 октября 2009 г.** включительно. Подача документов по почте не допускается.

Условия продажи лотов: в аукционе имеют право участвовать индивидуальные предприниматели, физические и юридические лица.

При подаче заявления участник должен иметь: 1) заверенную банком копию платежного поручения, подтверждающего внесение задатка для участия в аукционе; 2) физическое лицо – паспорт; представитель физического лица – паспорт и нотариально заверенную доверенность; индивидуальный предприниматель – паспорт, копию свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя и его подлинник для заверения его копии организатором аукциона; представитель индивидуального предпринимателя – паспорт и доверенность; представитель юридического лица (резидент РБ) – паспорт (руководитель – копию приказа, протокола о назначении на должность), доверенность на участие в аукционе и на подписание документов, копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации